**Нацыянальная бібліятэка Беларусі праводзіць літаратурны конкурс "Беларускі салавей" у гонар 135-годдзя з дня нараджэння беларускага пісьменніка і мовазнаўца Змітрака Бядулі.**

# Беларускі салавей

Арганізатары конкурсу вырашылі ўшанаваць памяць беларускага класіка праз творчыя работы. "У Год народнага адзінства нам захацелася аб'яднаць беларусаў, якія жывуць па ўсім свеце. Таму наш конкурс не толькі для тых, хто жыве ў Беларусі, але і для беларусаў, якія жывуць за мяжой. Ужо адгукнуліся Індыя, Нідэрланды, Расія, Вялікабрытанія, Ізраіль", — падкрэсліла вядучы бібліёграф сектара аналітычнай інфармацыі па культуры і мастацтве інфармацыйна-аналітычнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Саната Казлаўскайце.

Далучыцца да конкурсу "Беларускі салавей" могуць усе жадаючыя незалежна ад узросту. Так, сёння самаму малодшаму ўдзельніку 11 гадоў, а самаму старэйшаму — 71. Для ўдзелу ў конкурсе неабходна напісаць эсэ з сюжэтнай лініяй (prequel, sequel або spin-off) па адным з прапанаваных твораў Змітрака Бядулі: "Салавей", "Сярэбраная табакерка", "Бондар", "На Каляды к сыну".

"Конкурс стартаваў 1 кастрычніка, і сёння нам даслалі ўжо амаль 100 работ. Пакуль больш за ўсё людзей, якіх зацікавіў твор "На Каляды к сыну", і пішуць у асноўным сіквелы, бо многім хочацца, каб гэты твор меў добры канец, — дадала спецыяліст бібліятэкі. — Сюжэт эсэ можа адлюстроўваць жыццё як галоўных, так і другарадных герояў, што па ўнутранай храналогіі папярэднічала б падзеям твора (prequel) ці стала б яго працягам (sequel). У эсэ можа быць прадстаўлена і паралельнае арыгінальнаму сюжэту развіццё падзей, дзе сустракаюцца ўжо знаёмыя нам персанажы ці эпізоды, якія адбываліся на другім плане (spin-off)".

Акрамя таго, эсэ павінна мець назву і быць упершыню прадстаўлена для публікацыі. Ад аднаго ўдзельніка конкурсу прымаюцца нават некалькі работ пры ўмове выкарыстання сюжэтных ліній з розных вышэйназваных твораў Змітрака Бядулі. Ацэньваць конкурсныя работы будзе журы разам з ганаровым госцем Яфімам Плаўнікам — сынам Змітрака Бядулі. Вынікі творчага спаборніцтва падвядуць напярэдадні навагодніх свят.

Падрабязней азнаёміцца з інфармацыяй пра літаратурны конкурс "Беларускі салавей" можна на старонцы праекта "На хвалі часу, у плыні жыцця" на партале *www.nlb.by.*

**Вольга АНТОНЕНКАВА.**
*antonenkava@nastgaz.by*